✓**11 студзеня** ў зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«Напрадвесні беларускай навукі»**, прымеркаваная да 100-год-

дзя з дня заснавання Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта), першай у гісторыі Беларусі шматгаліновай навукова-даследчай установы, папярэдніка НАН Беларусі. На ёй экспануюцца каля 150-і выданняў, асноўную частку з якіх складаюць выданні Інбелкульта. Сярод прадстаўленых кніг – «Беларуская навуковая тэрміналогія», «Беларускі архіў», «Апісанне Горацкага раёну», «Чатырохсотлецце беларускага друку», «Віцебскі краёвы слоўнік» М. Касьпяровіча, «Говоры восточных уездов Гомельской губернии в их современном состоянии» П. Растаргуева, «Беларуская архітэктура ў XI – XII стст.» М. Шчакаціхіна і шмат іншых. Экспазіцыя аздоблена фотаздымкамі і дапоўнена сучаснымі выданнямі аб навуковай дзейнасці Інбелкульта. Працуе выстава па 28 лютага.